Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІСТАПАД 20 1932 г. № 259 (4511) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

АДОЗВА АНГЕЛЬСКАЙ КАМПАРТЫІ

ЛЕНДАН. Канферэнцыя ангельскай кампартыі зьвярнулася з адозвай да ангельскіх працоўных мас. У адозьве кампартыя зазначае, што канферэнцыя адбываецца ў найбольш крытычны перыяд у гісторыі ангельскай рабочай клясы. Маніфэст падрабязна спыняецца на наступленьні капіталістаў на рабочую клясу, выкрываючы здрадніцкую ролю рэфармісцкай прафбюракратыі і лейбарысцкіх лідэраў, якія зрываюць барацьбу тэкстыльшчыкаў, аўтобусных рабочых і беспрацоўных.

«Мільёны прыгнечаных рабочых і сялян, — гаворыцца далей у адозьве, — у калёніях, у Кітаі, Індыі і Ірляндыі вядуць гераічную барацьбу супроць брытанскага імпэрыялізму. Кампартыя заклікае ангельскіх рабочых разам з рабочымі калёній змагацца за зьвяржэньне ангельскага капіталізму. Пратэстуючы супроць дэнансаваньня англо-савецкай гандлёвай згоды, кампартыя падкрэслівае неабходнасьць узмацніць барацьбу супроць ваеннай небясьпекі і стаць на абарону Савецкага саюзу».

АДСТАЎКА ФОН-ПАПЭНА

Спробы фон-Папэна стварыць парляманцкае прыкрыцьцё для фашысцкай дыктатуры ў выглядзе ўраду «нацыянальнай канцэнтрацыі» пацярпелі поўны правал. Габінэт фон-Папэна падаў у адстаўку.

У гэтым няма нічога нечаканага. Гэта — просты рэзультат далейшага абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяў у краіне і ўзмоцненага разладу сярод саміх пануючых капіталістычных груп. Ужо непасрэдна пасьля выбараў рад кіруючых органаў буржуазнага друку выказаўся за неабходнасьць перамен у складзе цяперашняга ўраду, паколькі фон-Папэн аказаўся яўна няздольным ажыцьцявіць задачу пашырэньня базы фашысцкай дыктатуры. За выключэньнем партыі нацыяналістаў і часткова народнай дэмакратыі, удзельная палітычная вага якой, да рэчы сказаць, вельмі панізілася ў рэзультаце выбараў, усе астатнія партыі буржуазіі занялі адмоўную пазыцыю ў адносінах да Папэна.

Гэта з поўнай акрэсьленасьцю выявілася ў часе яго перагавораў з лідэрамі партыі аб стварэньні ўраду «нацыянальнай канцэнтрацыі». І партыя цэнтру, і баварская народная партыя, і нацыянал-сацыялісты, і сацыял-фашысты адмовіліся прымаць удзел ва ўрадзе, кіраваным фон-Папэнам. Нацыянал-фашысты і сацыял-фашысты ўхіліліся нават ад усякіх перагавораў з ім.

Партыя цэнтру і баварская народная партыя, у прынцыпе выказваючыся за ўрад «нацыянальнай канцэнтрацыі», з мэтай унікнуць новага роспуску рэйхстагу, жадаюць аднак, каб задачу палітычнага аб'яднаньня розных груп буржуазіі ўзяў на сябе сам прэзыдэнт. У той-жа час яны абвяргаюць эканамічную і палітычную праграму цяперашняга габінэту. У гэтым няма супярэчнасьці, паколькі Гіндэнбург цалкам падтрымлівае гэту праграму, абумоўліваючы яе прыняцьцем уступленьне ва ўрад «нацыянальнай канцэнтрацыі».

Нацыянал-сацыялісты дэманстрацыйна адмовіліся ад удзелу ў перагаворах, настойваючы на ранейшым сваім патрабаваньні, каб рэйхсканцлерам быў назначан Гітлер. Нацыянал-сацыялісты разьлічваюць, што кіруючыя колы буржуазіі, напалоханыя ўзмоцненай рэвалюцыянізацыяй мас, вялізарнай перамогай кампартыі на выбарах, больш ахвотна аддадуць бразды праўленьня Гітлеру. І сапраўды, уплывовая правая «Дэйчэ Альгемэйнэ Цайтунг» ужо акрэсьлена выказваецца за «рызыку» перадачы ўлады нацыянал-сацыялістам. Апошнія зараз асабліва моцна цягнуцца да ўлады, каб атрымаўшы яе адразу папраўіць сваё пахіснутае становішча.

Сацыял-фашысты, прызнаючы ўрад баронаў і памешчыкаў «меншым злом» (чым Гітлер), ахвотна пайшлі-б на зьдзелку з фон-Папэнам, калі-б іх не палохала паляваньне мас, усё больш узмоцнены адыход іх да камуністаў. Цікава, што матывуючы неабходнасьць прыцягненьня да перагавораў сацыял-дэмакратаў, рэйхсканцлер заявіў, што «ў адносінах дзелавой палітыкі ўраду розьніца ў поглядах паміж урадам і сацыял-дэмакратыяй зусім не такая глыбокая». Вельс і Брэйтшэйд ахвотна пайшлі-б у абдымкі Папэна, ажыцьцяўляючы з ім агульную для іх праграму выратаваньня гніючага капіталізму, калі-б не ўзрастаючае бражэньне ў сацыял-дэмакратычных радох.

Унутры-палітычнае становішча ў Германіі такім чынам яшчэ больш ускладнілася. Выбраны рэйхстаг ня зьбіраецца, яшчэ невядома ці зьбярэцца ён наогул. Імкненьне пашырыць базу фашысцкай дыктатуры шляхам аб'яднаньня рознастайных палітычных груп буржуазіі натыкнулася на супярэчнасьці ў капіталістычным лягеры, якія ўзмацніліся ў рэзультаце эканамічнага крызісу, на супярэчнасьці паміж прамысловасьцю, працуючай на замежны рынак, і аграрыямі, паміж мэталяапрацоўчай і мэталяздабываючай прамысловасьцю, паміж прамысловасьцю і банкамі.

Яркім довадам абвастрэньня ўнутранога разладу ў лягеры пануючых клясаў зьяўляецца ня толькі зрыў спроб стварыць «нацыянальную канцэнтрацыю», але і змова аб «адзіным фронце» супроць цэнтральнага ўраду паўднёвых і сярэдня-германскіх дзяржаў.

Цяжка прадбачыць як будуць у далейшым разьвівацца палітычныя падзеі ў Германіі. Ясна адно — усякія спробы пашырэньня парляманцкага базісу фашысцкай дыктатуры асуджаны на правал, незалежна ад таго ці будзе гэтыя спробы ажыцьцяўляць Папэн, ці «сам» Гіндэнбург, ці хто-небудзь яшчэ.

Магчыма, што гэтыя спробы прадстаўляюць сабой ня больш як манэўр з мэтай выйграць час, бо ідэя парляманцкага габінэту, хаця-б і ў выглядзе «нацыянальнай канцэнтрацыі», супярэчыць ідэі «прэзыдыяльнага» габінэту, якую адстойвае Гіндэнбург. Ня выключана магчымасьць, што габінэт фон-Папэна, магчыма з некаторымі пэрсанальнымі зьменамі, застанецца пры ўладзе ў якасьці «дзелавога габінэту». Але гэта ня вырашае палітычнага крызісу. Пры вялікай актыўнасьці палітычнага жыцьця народных мас Германіі, нельга ня лічыцца з іх настроямі і поглядамі.

Нясумненна, што будуць зроблены новыя спробы, іншымі асобамі і ў іншым выглядзе пашырыць фашысцкі фронт, каб процістаяць нарастаючай рэвалюцыйнай хвалі, мэтадамі разьюшанага фашысцкага тэрору задушыць рабочую клясу і абезначаліць яе.

Пралетарыят Германіі, які расстроіў пляны Папэна, пад кіраўніцтвам кампартыі, умацоўваючы адзіны фронт зьнізу, у баявой гатоўнасьці сустрэне новыя спробы буржуазіі кансалідаваць сілы фашызму. Выбары ў рэйхстаг і апошняя стачка бэрлінскіх транспартнікаў гавораць аб тым, што ўсё большыя масы германскага пралетарыяту пачынаюць бачыць адзіны выхад з крызісу — выхад рэвалюцыйны.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Прыношу сардэчную ўдзячнасьць арганізацыям, установам, таварышом і аддзельным асобам, выказаўшым сваё спачуваньне з поваду сьмерці майго блізкага прыяцеля і таварыша Надзежды Сяргееўны Алілуевай-Сталінай.

І. СТАЛІН.

191.000 тон бульбы Ленінграду

Адпраўляць бульбу ў ацепленых вагонах!

СТАНЦЫЯ ГОМЕЛЬ ЗАТРЫМЛІВАЕ НАГРУЖАНЫЯ ВАГОНЫ

Прастоі і пробкі на гомельскім вузьле

ГОМЕЛЬ. Факты гавораць аб нездавальняючай рабоце Гомельскага вузла па адгрузцы бульбы Ленінграду. Ёсьць рад выпадкаў затрыманьня прыбываючых вагонаў.

2 лістапада на ст. Гомель-сартавачная з цягнікам № 365 прыбыло 6 вагонаў з бульбай, якія прасталі каля 15 гадзін. 3-га лістапада па віне дыспэтчарскага апарату вагоны прасталі 16 гадзін, 5 лістапада прастой 7 вагонаў дасягнуў 26 гадзін. Такіх фактаў можна прывесьці шмат. Прастоі адгружаных вагонаў — сыстэматычнае зьявішча на вузьле.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі чыгункі не змагаюцца за своечасовае фармаваньне і адпраўку эшалёнаў. Няма штодзённага кантролю за работай дыспэтчарскага апарату ў гэтай галіне.

Ня лепш стаіць справа з падвозкай бульбы водным транспартам. Згодна заданьня, водным шляхам павінна быць перавезена каля 3.500 тон бульбы, фактычна-ж перавезена толькі 300 тон. Кіраўніцтва воднага транспарту ня прымае ніякіх мер для паскарэньня перавозкі бульбы. Наглядаецца блытаніна з падачай суднаў. Напрыклад, на р. Сож, на прыстанях Прапойск, Судакова судны стаяць па тры дні з-за адсутнасьці бульбы, у той-жа час на прыстані Карма ўжо 10 дзён ляжыць 140 тон бульбы таму, што няма суднаў.

Недахват грузчыкаў таксама адбіваецца на ходзе адгрузкі. На перавалачным пункце замест 100 грузчыкаў працуе толькі 30.

З-за недахвату рабочай сілы 10 лістапада была затрымана адпраўка 40 вагонаў. Адміністрацыя замест арганізацыі рабочай сілы займаецца толькі голым канстатаваньнем фактаў.

Мала клапоцяцца аб своечасовай адпраўцы бульбы таксама загатоўчыя арганізацыі і прадстаўнікі ЛСПО. За апошнія чатыры дні на бліжэйшых станцыях Цэрахаўка, Якімаўка, Каробічы па віне загатоўчых арганізацый не нагружана 25 вагонаў. 10 лістапада з Лоева дастаўлена 14 тон бульбы ў дзіравых мяшках. Пры выгрузцы палова бульбы рассыпалася і папсавалася. Прадстаўнікі ЛСПО ніякай увагі на гэта не зьвярнулі, не палічылі нават патрэбным пераважыць бульбу. 8 лістапада водным транспартам прыбылі на адрас упаўнаважанага ЛСПО дзьве баржы. Упаўнаважаны не падрыхтаваўся да прыёмкі — ня было ні тары, ні вагонаў. Прывезеная бульба праляжала некалькі дзён у пакгаўзе.

Адсутнасьць аперацыйнага кіраўніцтва работай Гомельскага чыгуначнага вузла ў галіне адгрузкі бульбы тармозіць своечасовае выкананьне пляну, стварае пэўную пагрозу псаваньня падвезенай прадукцыі.

Партарганізацыя вузла павінна мабілізаваць рабочы калектыў і напружыць усе сілы для ліквідацыі пробак. Гомельскія чыгуначнікі павінны паказаць узор бальшавіцкай работы.

С. ПАПЯРЭЦКІ.

Буксірная брыгада Заслаўскага раёну — у Асіпавічах

АСІПАВІЧЫ. Гэтымі днямі ў Асіпавічы прыехала буксірная брыгада Заслаўскага раёну, на чале з сакратаром райкому партыі тав. Кудзельскім, для дапамогі раённым арганізацыям у ліквідацыі адставаньня па адгрузцы.

Тав. Кудзельскі падзяліўся вопытам работы Заслаўскага раёну і расказаў, як раён дабіўся перамог на фронце загатовак і адгрузкі.

— У аснову барацьбы за бульбу было пакладзена шырокае разгортваньне масава-растлумачальнай работы вакол кампаніі.

— Устаноўлены пераходныя чырвоныя і рагожныя сьцягі. Сельсавету, які заваяваў чырвоны сьцяг, сельспажывтаварыства выдае на 50-100 проц. больш прамтавараў, працаўнікі гэтага сельсавету атрымліваюць павышаную зарплату.

— Вывешваньне чорных і чырвоных дошак практыкуецца ня толькі пры сельсаветах, але і ў кожным калгасе, вёсцы, паселішчы і на рынках.

— Па сельсаветах скліканіся тэхнічныя нарады сумесна з камісіямі садзейнасьці, членамі сельсавету і актывам, на якіх заслухоўваліся інфармацыі аб ходзе загатовак.

— Ударныя жаночыя брыгады з лепшых калгасьніц, бяднячак і серадлячак — адзінасобніц паказалі сапраўды баявыя тэмпы работы і зьявіліся лепшымі агітатарамі на вёсцы.

— Перадавыя калгасы, выканаўшыя своечасова свае заданьні па загатоўках, бралі на буксір адстаючых. Загатоўчыя арганізацыі ведаюць кожную кулацка-заможную гаспадарку і яе заданьне, а таму ёсьць поўная магчымасьць кантраляваць выкананьне цьвёрдых заданьняў.

— Раённы і нізавы друк зьявіўся лепшым арганізатарам мас на выкананьне пляну. У газэтах былі шырока папулярызаваны сацыялістычныя мэтады работы перадавых калгасаў і сельсаветаў, а таксама выкрывалася бязьдзейнасьць адсталых.

— У выніку ўсяго гэтага Заслаўскі раён поўнасьцю выканаў свой абавязак перад пралетарамі гораду Леніна, адгрузіўшы 111 проц. пляну.

— Абвешчаны пяцідзёнік штурму па Асіпавіцкім раёне павінен быць ператвoран у масавы паход усёй партыйнай і камсамольскай арганізацыі за хутчэйшае выкананьне пляну адгрузкі.

— Скарыстаўшы выпрабаваныя мэтады і бальшавіцкі вопыт Заслаўшчыны, Асіпавіцкі раён павінен у бліжэйшыя дні завяршыць кампанію.

К. П.

Замацаваць і разьвіваць дасягнутыя тэмпы

БАБРУЙСК. (Наш спецкор.).

У сувязі з прыездам першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало, тэмпы адгрузкі бульбы Ленінграду значна ўзмацніліся. За апошнюю пяцідзёнку процант выкананьня заданьня павысіўся з 50 да 70.

16 лістапада Бабруйск адгрузіў чырвоны эшалён імя тав. Гікало в 30 вагонаў — 400 тон; 17 — 160 тон; 18—18 вагонаў — 250 тон. На 19 лістапада плян адгрузкі выканан на 78,7 проц.

Некаторыя сельсаветы, як Восаўскі, Гарбацэвіцкі, Каменскі, Каваліўскі, Паўлавіцкі, Падрэцкі, Туркаўскі выканалі свае пляны на 80—90 проц., даўшы прырост за пяцідзёнку на 15—28 проц.

Нічога не зрабілі Ка[illegible], Лепчан-[illegible], Батушэўскі сельсаветы, якія за апошнія дні не адгрузілі ні аднэй тоны. Прэзыдыумы гэтых сельсаветаў павінны быць прыцягнуты да адказнасьці за бязьдзейнасьць і невыкананьне дырэктыў.

Бабруйшчына ні ў якім разе не павінна здаць тэмпаў, заваяваных у апошнія дні. Нельга дапусьціць таго, каб першыя замаразкі адмоўна адбіліся на ходзе кампаніі. Між тым, факты гавораць, што ў сувязі з наступленьнем халадоў, шмат брыгадзіраў і работнікаў сельсаветаў паддаліся дэмабілізацыйным настроям. 18 лістапада паступіў рад запытаньняў сельсаветаў — ці трэба везьці бульбу ці не. Саўгас Жылічы спыніў адгрузку, не адважыўшыся адкрыць бурты.

Бабруйская РКК РСІ выключыла з партыі і зьняла з работы загадчыка Цялускага загатоўчага пункту Аляшкоўскага. Гэты махровы апартуніст сьвядома зрываў адгрузку Ленінграду, прымаючы нягодную для спажываньня дробную бульбу.

Баявая задача загатоўчых арганізацый — зараз прыняць усе меры для захаваньня бульбы, якая прывозіцца з калгасаў, асабліва ўначы, прыкрыць саломай, брэзэнтам і мяшкамі фурманкі і грузавікі.

За апошні час зьнізіліся тэмпы загатовак бульбы па раёну. Прырост за трэцюю пяцідзёнку лістапада складае ўсяго 7—8 проц. Кіруючыя арганізацыі Бабруйшчыны павінны ўзмацніць загатоўкі, каб не затрымліваць адгрузку, каб поўнасьцю выканаць заданьне.

Л. К.

Зрываюць адгрузку

1. Нараўлянскі — 37,9 проц.
2. Прапойскі — 47,2 проц.
3. Лоеўскі — 47,3 проц.
4. Бялыніцкі — 61,4 проц.
5. Чырвона-Слабодскі — 62,5 проц.
6. Клічаўскі — 62,5 проц.
7. Дубровенскі — 63,2 проц.
8. Чавускі — 64,1 проц.
9. Буда-Кашалёўскі — 64,8 проц.
10. Асіпавіцкі — 64,9 проц.
11. Вушацкі — 66,1 проц.
12. Смалявіцкі — 66,1 проц.

Засталося 19 тысяч тон

ПАВОДЛЕ ДАНЫХ КАМІТЭТУ ЗАГАТОВАК ПРЫ СПА, ПА СЫСТЭМАХ БЕЛКААПГАРОДНІНЫ І БЕЛПЛОДАГАРОДНІНЫ НА 19 ЛІСТАПАДА АДГРУЖАНА ЛЕНІНГРАДУ 172.411 ТОН БУЛЬБЫ. ЗА ДЗЕНЬ 18 ЛІСТАПАДА АДПРАЎЛЕНА 3.369 ТОН.

АГУЛЬНЫ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ВЫКАНАН НА 90,3 ПРОЦ. ЗАСТАЛОСЯ АДПРАВІЦЬ 19.000 ТОН.

ЗАДАНЬНЕ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ.

Кулацкая арытмэтыка

РАГАЧОЎ. (БелТА). Пасобныя калгасы раёну, дзе праўленьні апынуліся ў палоне кулацкіх тэндэнцый, разьмеркавалі ўраджай бульбы паміж калгасьнікамі, ня прыняўшы мер да поўнага выкананьня заданьня. Праўленьне калгасу «Чырвоны гарадок», Касьцянеўскага сельсавету, сабраны ўраджай бульбы з плошчы ў 25 га разьмеркавала паміж калгасьнікамі, выдаўшы па 15 клг. на працадзень, потым ссыпала насенны фонд, а дзяржаве здала рэшту ў... 16,3 тоны, між тым плян складае 25 тон.

**

ЛЕПЕЛЬ. (БелТА). Кіраўніцтва калгасу імя Войкава не мабілізавала калгасьнікаў на загатоўку і адгрузку бульбы. Замест выкананьня пляну, калгас разьмеркаваў бульбу сярод сваіх членаў, а заданьне па здачы 22 тон ня выканана. РКК выключыла з радоў партыі старшыню калгасу імя Войкава Б. ПАПКО. Вынесены вымовы сакратару парт'ячэйкі калгасу ПАЛЕНСІЯНКУ і старшыні сельсавету ЖЭНЖЫКУ.

РАБОЧЫЯ МЕНСКУ УХВАЛЯЮЦЬ ПАСТАНОВУ УРАДУ АБ БАРАЦЬБЕ З ПРАГУЛАМІ

ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ПРАЦУЮЦЬ БЕЛАН І ГІТЦЫ

Рабочыя чырванасьцяжнай гарбарні «Бальшавік», вітаючы пастанову ЦВК і Саўнаркому СССР аб звальненьні за прагулы бяз уважлівых прычын, у сваёй рэзалюцыі запісалі:

—«Склад рабочай клясы рознастайны. Побач з кадравымі рабочымі, на нашых прадпрыемствах ёсьць шмат маладых рабочых, якія не адразу прызвычайваюцца да сацыялістычных мэтадаў і форм работы. Мы абяцаем узмацніць масава-растлумачальную работу сярод новых рабочых. АБВЯШЧАЕМ БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ПРАГУЛАЎ І САМІХ ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ. Магутнай калёнай, цьвёрдым крокам, мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пад кіраўніцтвам партыі Леніна пасьпяхова ажыцьцявім і задачы другой пяцігодкі— пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.»

Многія рабочыя заводу ў адказ на пастанову ўраду аб барацьбе з прагуламі, замацоўваюць сябе на гарбарні да канца другой пяцігодкі.

На мітынгу рабочых, 19 лістапада прынята абяцаньне ПОЎНАСЬЦЮ ЗЬНІШЧЫЦЬ ПРАГУЛЫ, якія мелі месца да гэтага часу. За 10 месяцаў гэтага году прагулы на «Бальшавіку» складаюць 105 дзён. Нават ЗА 10 ДЗЁН ЛІСТАПАДА ЎЖО ЁСЬЦЬ ТРЫ ПРАГУЛЫ.

Зараз калектыў рабочых «Бальшавіка» павінен па-бальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю прынятых абавязацельстваў. КОЖНЫ РАБОЧЫ ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ПРАЦУЮЦЬ СТАРЫЯ КАДРАВІКІ РАБОЧЫЯ БЕЛАН І ГІТЦЫ. Рабочы тав Белан (2-гі хромавы цэх) на «Бальшавіку» працуе з 1919 году, і за ўвесь час сваёй работы ў яго ня было нават ні аднаго спазьненьня. Тав. Гітцы—рабочы гэтага-ж цэху працуе на вытворчасьці больш 35 год (на гарбарні «Бальшавік»—12 год). Прагулаў ён таксама нікалі ня меў і «ніколі ня буду іх мець» —сказаў тав. Гітцы.

Белан і Гітцы не адзінкавыя. Такіх на «Бальшавіку» дзесяткі. Па іх павінны раўняцца ўсе рабочыя гарбарні.

В.

Варашылаўцы аднадушна вітаюць пастанову ўраду

Пазаўчора і ўчора (18 і 19 лістапада) па ўсіх цэхах заводу імя Варашылава праведзены сходы, на якіх рабочыя-мэталісты абгаворвалі пастанову ўраду аб прагулах.

На ўсіх цэхавых сходах, асабліва ў вядучых цэхах, прысутнічала амаль 100 проц. складу рабочага калектыву. Рабочыя-кадравікі заводу аднадушна ўхваляюць пастанову ўраду.

Тав. Пагоцкі, які ўжо звыш 40 год працуе на мэталяапрацоўчых заводах і пяць год на заводзе імя Варашылава, на якім не зрабіў ні аднаго прагулу, кажа:

— Пастанова ўраду аб прагулах зьяўляецца магутным сродкам узьняцьця працоўнай дысцыпліны. А без дысцыпліны прамфінплян выканаць нельга.

Зараз ужо кожны прагульшчык ведае, што сапраўдныя ўдарнікі сацыялістычнага будаўніцтва па яго працаваць ня будуць.

Старэйшыя кадравікі ліцейнага — Качанаў, Кукса, Брайкоў і інш., вітаючы ў сваіх выступленьнях пастанову ўраду, выкрывалі канкрэтных прагульшчыкаў, сурова ганьбілі іх учынкі.

Агульны сход рабочых сьлясарна-зборачнага цэху пасьля абгаварэньня пастановы ўраду, якая была аднадушна ўхвалена, пастанавіў патрабаваць ад адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый дакладнага выкананьня пастановы ўраду. Апрача таго, сход узяў на сябе абавязак канчаткова ліквідаваць прагулы ў сваім цэху.

Пр.

Прагулы б'юць ня толькі па прамфінпляну, але і па зарплаце

Учора на швейнай фабрыцы «Кастрычнік» па ўсіх цэхах і агрэгатах адбыліся рабочыя сходы па абгаварэньні пастановы ўраду аб барацьбе з прагульшчыкамі.

Выступаўшыя на сходах рабочыя віталі і ўхвалялі пастанову ўраду, як важнейшае мерапрыемства па ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны.

— Трэба вітаць гэта важнейшае мерапрыемства ўраду, — заявіў стары рабочы 3-га агрэгату тав. **Бацьвіньнік.** — Яно зьяўляецца моцным ударам па прагульшчыках і лятунох — зрыўшчыках бальшавіцкіх плянаў. Кожны сьвядомы рабочы павінен дапамагчы фабрычна-заводзкім арганізацыям у выяўленьні злосных прагульшчыкаў і патрабаваць неадкладнага ўжываньня мер да іх, згодна пастановы ўраду.

Старая работніца 2-га агрэгату т. Чартова ў сваім выступленьні жорстка крытыкавала канкрэтных прагульшчыкаў фабрыкі, якія зрывалі выкананьне вытворчай праграмы.

— Пастанова ўраду, — заявіла яна, — зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам па ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны. **Ва ўмовах нашай фабрыкі, дзе ўведзена паточная сыстэма, прагулы ня толькі б'юць па прамфінпляну, але і па зарплаце адданых справе рабочых, якія прымушаны рабіць прастоі з-за непадачы дэталяў па канвэеру.**

У рэзалюцыях, прынятых сходамі, рабочыя аднадушна вітаюць і ўхваляюць пастанову ўраду і абавязваюцца прыняць усе меры да хутчэйшай яе рэалізацыі.

Ф.

На мітынгу на „Камунарцы“

Учора адбыўся на фабрыцы «Камунарка» шматлюдны мітынг усяго рабочага калектыву фабрыкі, прысьвечаны абгаварэньню пастановы ЦВК СССР аб барацьбе з прагуламі.

Пасьля інфармацыі выступалі асобныя рабочыя. Асабліва характэрнае выступленьне старой работніцы-ўдарніцы, члена гарсавету т. Базароўскай. Яна прыводзіць канкрэтныя прыклады і прозьвішчы работніц-прагульшчыц, гультаёў, ілжэ-ўдарніц, якія прыходзяць на работу а палове дзесятай замест 8 гадзін, а іншы раз яны рэгіструюцца і зусім адходзяць дамоў.

Камсамолка Шнітман зрабіла двухмесячны прагул, а камсамольскі калектыў толькі нядаўна вынес пастанову аб яе выключэньні.

Да гэтага часу ў фабрычным ЗРК атрымліваюць паёкі, бульбу і інш. прадукты тыя рабочыя, якія ўжо даўным даўно не працуюць на фабрыцы, але чамусьці карыстаюцца ўсімі правамі рабочых.

Толькі за кастрычнік месяц зроблена на фабрыцы 200 прагулаў па няўважлівых прычынах, з якіх 81 падае на карамельны цэх.

Пасьля кароткіх выступленьняў аднадушна прынята рэзалюцыя, у якой рабочыя вітаюць гэту пастанову, накіраваную на ўзмацненьне вытворчай дысцыпліны і ліквідацыі ўсіх момантаў, дэзарганізуючых вытворчасьць.

Сход патрабуе ад усіх фабрычных арганізацый, ад усёй грамадзкасьці яшчэ больш рашуча ўзмацніць барацьбу з прагульшчыкамі, гультаямі, сымулянтамі і зрыўшчыкамі выкананьня вытворчых плянаў.

Рабочы калектыў абавязвае ЗРК тэрмінова прыняць усе захады для ачысткі ад тых лятуноў і прагульшчыкаў, якія да сёньняшняга дня забясьпечваюцца фабрычным рабочым каапэратывам.

Адначасова з гэтым даручана фабрычным арганізацыям прапрацаваць пастанову ў кожным цэху, у кожнай брыгадзе, узмацніўшы масава-выхаваўчую работу, асабліва сярод новых рабочых.

І.

Нам з імі не па дарозе

Рабочыя, ІТР і служачыя менскага вагона-рамонтнага заводу імя Мясьнікова пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР аб звальненьні за прагул бяз уважлівых прычын сустрэлі з вялікім энтузіязмам.

На мітынгах, якія былі праведзены па ўсіх цэхах заводу, рабочыя ў сваіх шматлікіх выступленьнях адзначалі правільнасьць і своечасовасьць пастановы.

— Наша краіна ліквідавала беспрацоўе і з посьпехам заканчвае першую пяцігодку, — зазначалі рабочыя. — Уступаючы ў другую пяцігодку, якая ставіць сваёй мэтай пабудову бясклясавага грамадзтва, мы ня можам цярпець у нашых радох прагульшчыкаў і лятуноў, якія зрываюць нармальны ход працы.

У сваіх пастановах рабочыя патрабавалі звальненьня з работы заўзятых лятуноў і прагульшчыкаў, накшталт **Элькінда, Новікава, Шушкевіча, Крываносава, Чупраса** і інш., якія прыйшлі на завод для таго, каб атрымаць прадуктовыя карткі.

Іменна з прычыны наяўнасьці такіх «рабочых», як Элькінд, Новікаў і інш., на заводзе ў верасьні было прагулаў 395 чалавека-дзён, а ў кастрычніку яны дасягнулі 490 дзён.

Так сустрэлі пастанову ўраду рабочыя, ІТР і служачыя заводу імя Мясьнікова.

Р—ч.

ПАВЯДЗЕМ БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ

Мы, рабочыя, работніцы, служачыя і ІТР абутковай фабрыкі, сабраўшыся на мітынг і азнаёміўшыся з пастановай ЦК і СНК СССР аб звальненьні за прагул бяз уважлівых прычын, лічым гэту пастанову правільнай і своечасовай.

Наша краіна, пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК, на чале з тав. Сталіным, поўнасьцю ліквідавала беспрацоўе і мы ў нашых радох ня можам цярпець прагульшчыкаў, гультаёў і рвачоў, прышоўшых на фабрыку, каб толькі атрымаць харчовыя карткі. **Гэта яны, прагульшчыкі, тармозяць выкананьне прамфінпляну і зьяўляюцца бічом вытворчасьці.**

Мы, рабочыя абутковай фабрыкі імя Кагановіча, прымем самыя рашучыя меры, павядзем бязьлітасную барацьбу з прагуламі і выканаем прамфінплян па ўсіх яго паказальніках.

Ніводнага прагулу і спазьненьня сярод нашага калектыву. Ачысьцім свае рады ад прагульшчыкаў — ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва. (Рэзалюцыя прынята аднагалосна).

Ім ня месца на прадпрыемстве

Гудок абвясьціў перапынак на абед. Але ні адзін рабочы ўцільцэху заводу ІМЯ МОЛАТАВА ня ідзе ў сталоўку.

— Сёньня ў часе перапынку будзе мітынг, прысьвечаны абмеркаваньню пастановы саюзнага ўраду аб барацьбе з прагуламі.

Работу ўцільцэху падрываюць прагульшчыкі, рвачы і лятуны. Гэта-ж ня жарты: за адзін кастрычнік у цэху прагуляна 108 чалавека-дзён. І таму з такой радасьцю рабочыя ўцільцэху сустрэлі пастанову ЦВК і СНК СССР, якая абвяшчае рашучую барацьбу з прагульшчыкамі і лятунамі.

— Цяпер будзе іншая справа.

— Прагульшчыкам зараз крышка.

— Або працуй, або ня еш. Ленін правільна пра гэта сказаў.

Такімі размовамі напаўняецца цэх у часе перапынку. У руках рабочых газэты — чытаюць пастанову ЦВК і СНК.

Прыкладныя рабочыя, рабкоры-ўдарнікі зьявіліся першымі застрэльшчыкамі ў праведзеньні пастановы ўраду ў жыцьцё. Вось тав. ТРЫГУБОВІЧ. Ён актыўны рабкор, ударнік і першы грамадчык у цэху. На заводзе працуе ўжо год. За гэты час не зрабіў ні аднаго прагулу, ні разу не спазьніўся на работу. Рабочыя паважаюць тав. Трыгубовіча, раўняюцца па ім.

Вось актыўныя ўдарнікі РОДЗІНСКІ і БАРАН, абодва плян выконваюць на 120—150 процантаў. Не зрабілі ні аднаго прагулу бяз уважлівых прычын, ня маюць спазьненьняў.

І вось гэту адданую, геройчную работу энтузіястаў-ўдарнікаў падрываюць дэзарганізатары сацыялістычнай вытворчасьці, прагульшчыкі, лятуны, рвачы.

Асабліва моцнае абурэньне ў рабочых выклікалі ПРАГУЛЬШЧЫКІ ШЭР І АНДРУСЯН.

— Два дні папрацуюць, а тыдзень зусім не паказваюцца на завод, — расказваюць рабочыя. Да сьвята 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі яны ня выходзілі на работу каля дзьвёх дзён. Перад сьвятам зьявіліся для таго, каб атрымаць паёк і, атрымаўшы яго, зноў зьніклі з заводу.

Прагульшчыку, рвачу, лятуну ня будзе больш месца на сацыялістычным прадпрыемстве.

Ф. БАЛЬКО.

Чаму тармозіцца пабудова ільназаводу

З красавіка месяца будуецца ільназавод «Бязбожнік», Чарнаўшчынскага сельсавету, Вушацкага раёну.

У свой час заводам быў прынят выклік ільназаводу «Барыкады» — пусьціць завод у жніўні г. г., але і па сёньняшні дзень плян будаўніцтва выканан толькі на 23,5 проц. Чым тлумачацца такія марудныя тэмпы будаўніцтва?

Па-першае тым, што дагэтуль не арганізавана праца, не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Брыгада цесьляроў на чале з гора-брыгадзірам Крывапушчанкай больш займаецца наведваньнем у рабочы час крамы сельспажывтаварыства, чым працай. **Рабочых дзён у месяц прыходзіцца ня больш 12, астатнія ідуць на прагулы, п'янку і г. д.**

Па-другое, РВК, райкалгассаюз і сельсавет займаюцца толькі пастановамі, не аказваючы будаўніцтву сапраўднай дапамогі.

Трэба арганізацыям Вушацкага раёну ўдарыць па прагульшчыках і па-бальшавіцку ўзяцца за будаўніцтва заводу.

Праходжы.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Кампартыя Германіі заклікае працоўных да рашучага адпору фашызму

БЭРЛІН, 19. ЦК кампартыі ў адозьве да ўсіх працоўных з поваду ўнутры-палітычнага становішча ў Германіі, канстатуючы поўны правал спробы Папэна зламаць масавую барацьбу рэвалюцыйнага германскага пралетарыяту, зазначае, што галоўная задача новага ураду Германіі—«поўнае зьнішчэньне камунізму». Адозва аналізуе спробы германскай буржуазіі пазбавіць працоўныя масы, беспрацоўную моладзь выбарчых правоў, увесьці двохпалатную сыстэму, ліквідаваць парлямант і ўстанавіць фашысцкую ваенную дыктатуру.

Адозва зварачае далей ўвагу рабочых мас на спробы паставіць па-за законам кампартыю Германіі і падрыхтоўку новых забойстваў рэвалюцыйных рабочых фашысцкімі штурмавікамі. Указваючы на спробы дабіцца згоды паміж Брунінгам і Гітлерам у пытаньні стварэньня «новага фашысцкага ураду», адозва заклікае ўзмацніць барацьбу супроць фашызму. Адозва растлумачвае, што на плечы працоўных мас Германіі будзе ўвален новы цяжар мытаў, прадстаіць далейшае зьніжэньне зарплаты, скарачэньне і без таго нізкіх дапамог па беспрацоўі, скасаваньне апошніх «сацыяльных законаў» і інш.

Адозва заклікае рабочую клясу Германіі да пільнасьці з прычыны небясьпекі новай вайны, ліхаманкавых узбраеньняў і цкаваньня Савецкага саюзу, якое ўсё больш узмацняецца.

Выкрываючы здрадніцкую і штрэйкбрэхэрскую ролю сацыял-дэмакратыі, адозва заклікае ствараць на аснове адзінага рабочага фронту зьнізу камітэты барацьбы для арганізацыі адпору наступленьню дзяржаўнага апарату і прадпрыемцаў на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас Германіі.

Адозва заклікае да барацьбы супроць вэрсальскай сыстэмы і супроць устанаўленьня фашысцкай дыктатуры, да барацьбы ў абарону Савецкага саюзу і за эканамічныя і палітычныя патрабаваньні рабочай клясы Германіі.

2 гады катаргі за аплявуху фашысту

БЭРЛІН, 18. За апошнія дні паліцыя зрабіла вобыскі ў друкарнях камуністычных газэт **у Ганаверы, Магдэбургу і Мюнхэне. Усе машыны апячатаны.** Падобныя-ж вобыскі былі зроблены ў друкарнях камуністычных газэт у Эсене і Дзюсельдорфэ. У Гамбургу арыштован **галоўны рэдактар** камуністычнай «Гамбургэр Фольксцайтунг»—Мэйер. Пры вобыску ў Мэйера адабраны некаторыя творы Маркса, Энгельса і Леніна, а таксама рукапісы з поваду 50-гадовага юбілею са дня сьмерці Маркса.

У Бэрліне **за аплявуху нацыянал-сацыялісту прыгаворан да 2-х год катаржнай турмы рабочы Карчмарэк.** Цяжка параніўшы Карчмарэка рэвальвэрным стрэлам, нацыянал-сацыяліст апраўдан. У Гільдбургхаўзне (Цюрынгія) прыгаворана да году катаржнай турмы работніца, якая разносіла ў часе выбараў у рэйхстаг па вуліцах выбарчыя плякаты кампартыі.

Сялянскія паўстаньні ў Юга-Славіі

ПАРЫЖ. «Юманітэ» ў адным з апошніх сваіх нумароў паведамляе аб пашырэньні сялянскіх паўстаньняў у Юга-Славіі супроць фашысцкай дыктатуры. За апошнія тыдні адбылося **больш 20 крывавых сутычак паміж сялянамі, з аднаго боку, і войскам, жандармэрыяй і паліцыяй — з другога.** Тысячы працоўных сялян пакідаюць сваю зямлю і ідуць у лясы, у горы, у паўстанцкія атрады і са зброяй у руках змагаюцца супроць урадавых войск.

У самой арміі ёсьць таксама факты адкрытага выступленьня супроць дыктатуры юга-слаўскага імпэрыялізму. На другі-ж дзень пасьля марыборскага працэсу супроць афіцэраў, якія абвінавачваліся ў змове супроць фашысцкай дыктатуры, многія афіцэры гарнізонаў **у Скопліё, Бігашы, Зворніку, Новым Саду** пашлі ў лясы і вядуць там барацьбу разам з партызанамі.

Як падае «Юманітэ», у апошнія дні партызаны пачалі адкрытую барацьбу ва многіх пунктах **Кроатыі, Славоніі, Далматыі і Босьніі.**

Адначасова з сялянскім рухам у Юга-Славіі пашыраецца і забастовачны рух. Вельмі часта забастоўкі ўзьнікаюць стыхійна. У гэтай барацьбе выкоўваецца баявы авангард юга-слаўскага пралетарыяту.

Кампартыя зьяўляецца арганізатарам і кіраўніком верасьнёўскіх забастовак ліцейшчыкаў у Зеньніку і Варэсе, рабочых-абутнікаў у Крушавацы, забастоўкі на прадпрыемствах у Восіку, дзе рабочыя-тэкстыльшчыкі яшчэ да гэтага часу вядуць барацьбу.

САВЕЦКА-РУМЫНСКІЯ АДНОСІНЫ

ВЕНА, 18. Буйная капіталістычная газэта «Дзімінаца», спыняючыся на пазыцыі Францыі ў пытаньні савецка-румынскага пакту аб ненападзе, канстатуе, што замежна-палітычная камісія францускага парляманту заняла процілеглы пазыцыі Румініі пункт гледжаньня. На словах газэты, «уплывовы член гэтай камісіі нядаўна правёў 8 дзён у Румыніі, вывучаючы бесарабскае пытаньне.» Ён вярнуўся,—кажа газэта,— у Парыж вельмі нездаволены рэзультатамі сваёй паездкі і, у прыватнасьці, пазыцыяй румынскага міністра замежных спраў.

«Зьяўленьне на сцэне Тытулеску,—піша далей газэта,—выклікала ўскладненьні, бо францускі ўрад лічыць, што яго назначэньне міністрам замежных спраў азначае зрыў перагавораў з Савецкім саюзам. У францускіх палітычных колах пачатую новым міністрам замежных спраў кампанію ў прэсе разглядаюць, як дзеяньні, накіраваныя супроць палітыкі Эрыё і, якія падтрымліваюць лінію францускіх правых колаў».

«Адэвэрул» піша: «Кіраўнікі нашай дзяржавы рабілі заявы, у якіх яны ня толькі называлі заключэньне пакту з СССР «безнадзейным», але стварылі нават уражаньне, быццам Румынія ў адкрыта варожых адносінах са сваім усходнім суседам. Яшчэ некалькі месяцаў назад мы падтрымлівалі з Савецкім саюзам, праўда ня прыяцельскія, але ў кожным выпадку карэктныя адносіны. Цяпер у нас спрэчка з савецкім урадам. У гэты-ж час Польшча і Францыя падрыхтоўваюць апошнія фармальнасьці для рэалізацыі пакту з Савецкім саюзам. Апошнія падзеі, у прыватнасьці дыплёматычныя крокі Польшчы і Францыі ў Бухарэсьце, паслужылі поводам для міжнароднай прэсы да рэзкіх камэнтараў наконт ахаладжэньня прыязных адносін Румініі са сваімі саюзьнікамі».

Указваючы далей на нездавальняючыя замежна-палітычныя адносіны Румініі з Італіяй і Германіяй, газэта піша: «Мы прымушаны з трывогай канстатаваць, што Румынія знаходзіцца ў становішчы палітычнай ізаляцыі ў нябывалай яшчэ ступені. У нас не засталося ні аднаго адкрытага, блізкага прыяцеля і мы страцілі нават прыязьнь тых, на падтрыманьне якіх разьлічвалі ў цяжкія моманты».

У румынскай газэце, якая выходзіць у Кішынёве, праф. Бухарэскага унівэрсытэту, член румынскай акадэміі навук Чыобану патрабуе заключэньня пакту з Савецкім саюзам, з мэтай устанаўленьня нармальных адносін.

НА 1-м ЗЬЕЗЬДЗЕ МЕНТЭКСТЫЛЬШВЭЙПРАМСАЮЗУ

Лепшай якасьці тавары шырспажыву павінна даць прамкаапэрацыя

Хто ня ведае ўмоў жыцьця саматужніка і рамесьніка былой царскай Расіі, а зараз капіталістычных краін? Голад, холад — вось шлях дробнага вытворцы пры капіталізьме.

Іншая справа ў нас. Бурныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва на аснове росту цяжкай індустрыі ня толькі ня руйнуюць дробнага вытворцу, а, наадварот, ствараюць усе ўмовы для ўсямернага павышэньня яго матар'яльнага становішча. Уступіўшы ў прамысловую каапэрацыю, саматужнік і рамесьнік уключаюцца ў агульны паток сацыялістычнага разьвіцьця народнай гаспадаркі. **Ад дробнага гаспадарчыка ўласнай майстэрні праз буйную калектыўную гаспадарку—прамысловую арцель, да сьвядомага будаўніка бяскласавага грамадзтва—вось шлях дробнага вытворцы пры дыктатуры пралетарыяту.**

На гэты шлях ужо цьвёрда сталі дзесяткі мільёнаў саматужнікаў і рамесьнікаў Савецкага саюзу. Арганізаваўшыся ў прамысловыя арцелі, яны нага ў нагу, плячо ў плячо з рабочай клясай ідуць па ленінскім шляху да сьветлай будучыні—сацыялізму.

Пераносячы вопыт сацыялістычных форм працы з буйных дзяржаўных фабрык і заводаў прамысловыя арцелі па-ўдарнаму змагаюцца за бальшавіцкія пляны, за баявое вырашэньне важнейшай праблемы—павялічэньня вырабу прамысловых тавараў, шырокага спажываньня.

Мільёны ўдарнікаў налічваюць у сваіх радох прамысловыя арцелі БССР, якія паказваюць узоры бальшавіцкай барацьбы за перабудову работы прамысловай каапэрацыі на аснове пастаноў партыі і ўраду. Першы міжраённы зьезд Ментэкстыльшвэйаб'яднаньня, які зараз адбываецца — буйны крок па шляху гэтай перабудовы.

З вялізарнымі перамогамі прышлі тэкстыльшчыкі і швэйнікі да свайго першага зьезду. Рэарганізаваўшыся з унівэрсальных райпрамсаюзаў у міжраённыя саюзы з аднолькавым характарам вытворчасьці, прамысловыя арцелі атрымалі цьвёрдае кіраўніцтва і вялікую самастойнасьць уласнай ініцыятывы па мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў і магчымасьцяй.

Вынікі першых крокаў перабудовы ў наяўнасьці. **Сыстэма ў цэлым за 3 кварталы выканала гадавы плян на 79,8 проц.** Асобныя прамарцелі паказалі сапраўды ўдарныя тэмпы, дабіўшыся бліскучых перамог у сваёй рабоце. Аб гэтых перамогах расказвалі зьезду ўдарнікі ў сваіх рапартох.

Пад гукі маршу і бурныя авацыі ўсяе залі, першымі ўваходзяць на сцэну ўдарнікі чырвонасьцяжнай **менскай трыкатажнай арцелі імя Крупскай.** Маладыя, поўныя адвагі і геройства—гэта яны разам з усім калектывам арцелі вышлі пераможцамі ва ўсесаюзным конкурсе, атрымаўшы першую прэмію.

— На аснове бальшавіцкай перабудовы работы і разгортваньня сацыялістычных форм працы,—рапартуе ўдарніца тав. Мянцова,—наша арцель дзесяцімесячную праграму **выканала на 109 проц. Брак даведзен да 1,5 проц., сабекашт прадукцыі зьніжан на 7,4 проц. Арцель мае два цэхі па рамонту абутку і два абменных пункты старых рэчаў на новыя.**

Будзем з яшчэ большай энэргіяй змагацца за колькасьць і якасьць прадукцыі шырспажыву—заканчвае свой рапарт тав. **Мянцова.** Конкурс скончан, але барацьба за шырспажыў працягваецца.

Рапарт кароткі, але кожнае яго слова гучыць пераможным маршам 3,5 тысячнага калектыву арцелі.

Сьледам за ўдарнікамі арцелі **імя Крупскай** слова для рапарту атрымліваюць ударнікі **капыльскай** арцелі краўцоў.

— Наша арцель,—рапартуе ўдарнік — **тав. Шофэр,** — у гэтым годзе паказала сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. **За 10 месяцаў мы выканалі гадавую праграму на 98,2 проц. Сустрэчны плян у 10 тыс. руб. намі таксама пасьпяхова ажыцьцёўлен. Зараз мы высоўваем новы сустрэчны—да канца году даць прадукцыі шырспажыву дадаткова на 10 тыс. руб.**

А ўдарнікі менскай кравецкай арцелі **«Пралетары»**? Яны таксама заваёўваюць ганаровае месца ў калёне перадавікоў. Апынуўшыся ў запазычанасьці перад дзяржаваю ў трэцім квартале, арцель мабілізавала ўсе свае сілы на павышэньне тэмпаў работы ў чацьвертым квартале. І павысіла. У кастрычніку яна ўжо дала 120 проц. пляну. Ёсьць усе падставы думаць, што ўдарнікі арцелі «Пралетары» поўнасьцю пакрыюць сваю запазычанасьць, пасьпяхова скончаць плян чацьвертага заключнага і па-баявому сустрэнуць другую пяцігодку.

Не адстаюць і ўдарнікі кравецкай арцелі **«Новы шлях».** Іх рапарт зьезду таксама сьведчыць аб вялікім вытворчым уздыме арцельшчыкаў.

— Плян трэцяга кварталу выканан на 110 проц., верасьнёўскі плян—на 105 проц. кастрычніцкі—на 106,6 проц.—вось лічба нашых перамог,—рапартуе ўдарнік арцелі тав. Гродштэйн.

Так, адна за другой уваходзілі на сцэну групы ўдарнікаў і рапартавалі зьезду аб тых вялізарных посьпехах, якія імі дасягнуты ўпартай работай ля варштатаў. Але яны ня ўтойвалі і недахопаў, слабых бакоў сваёй работы. Нават перадавікі ва ўсесаюзным маштабе, ударнікі арцелі імя Крупскай не пасаромеліся сказаць зьезду аб тым, што якасьць выпусканай імі прадукцыі ня зусім яшчэ добрая.

А ў галіне перабудовы работы? Тут таксама яшчэ далёка ня ўсё зроблена. Рэарганізаваць райпрамсаюзы ў міжраённыя саюзы —гэта толькі частка тэй вялізарнай работы, якую трэба правесьці ў галіне перабудовы. Вытворчая ініцыятыва кожнай арцелі—зарука далейшых перамог у вырашэньні праблемы павялічэньня фонду прамысловых тавараў шырокага спажываньня,—важнейшай задачы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ СЫСТЭМАТЫЧНА Б'ЮЦЬ І ГНОЯЦЬ У КАРЦЭРАХ

(ТУРМА У ВРОНКАХ)

У Вронках знаходзіцца каля 200 палітзьняволеных. За выключэньнем некалькіх чалавек, усе яны прывезены сюды галоўным чынам **з акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны.** Яны цэлымі гадамі ня маюць сувязі з сваімі сваякамі і сем'ямі, ня маюць магчымасьці атрымаць дапамогі, бо прыезд ці перасылка харчу каштуе вялікія грошы. Цяжка, часта немагчыма, дастаць іх беспрацоўнаму, або даведзенаму да апошняй галеты рабочаму і селяніну Польшчы. Яшчэ больш цяжка аплаціць дарогу ў Вронкі. Ды і ня толькі ў Вронкі.

Фашысцкі ўрад, у сувязі з нарастаючай рэвалюцыйнай хваляй, што раз, то больш частымі выступленьнямі працоўных Польшчы ў абарону палітзьняволеных, стараецца сканцэнтраваць іх у маленькіх мястэчках Пазнаншчыны. Апрача Вронак **перапоўнены турмы ў Грудзёнцу, Каранове, Равічу, Фардоне, Таруні і г. д.**

Кожная восень і зіма нясуць з сабой новыя цяжкія ахвяры. Арганізм палітзьняволеных зьнясілены голадам, недахватам паветра, вільготнымі мурамі, цэмэнтавай падлогай, бязупынным нэрвовым напружаньнем у барацьбе з фашысцкімі катамі. Абутак рваны, вопратка зьнішчана. У рэзультаце — галоўным чынам, **хваробы горла і тубэркулёз.**

Апошні 1932 год быў асабліва цяжкім. Ад пачатку яго цягнецца атака фашысцкай турэмнай адміністрацыі ў сувязі з уводзеньнем новага турэмнага рэглямэнту. Праведзен падзел палітзьняволеных па асьвеце, (нацыянальны падзел на яўрэяў і не яўрэяў, палякаў, беларусаў быў праведзен яшчэ да 1932 г.). Абмежавана права атрымліваць газэты, дапускаецца толькі ўрадавая прэса і то па адной газэце на чалавека на пару гадзін. Забраны сшыткі з камэр, апрача аднаго. Зьменшана колькасьць кніг у камэры да 2—3. Самы цяжкі ўдар быў нанесен палітзьняволеным пасьля сьвята 1 мая бягучага году. Турэмная адміністрацыя ліквідавала права перасылаць грошы, перадаваць прадукты і газэты ад аднаго палітзьняволенага другому. Ліквідаваны так званыя «перасадкі», гэта зн. права пераходзіць з адзіночкі ў адзіночку да другога палітзьняволенага на пару гадзін у дзень. Ад мая палітзьняволеныя сядзяць цэлыя дні ізаляваныя адзін ад другога.

Пагоршаны таксама і гігіенічныя ўмовы: лазьня раз на месяц, бялізна зьмяняецца таксама раз у месяц. Ежа з кожным месяцам пагаршаецца. **Людзі літаральна галадаюць.** Мэдычнай дапамогі няма. Доктар — белагвардзеец замест лячэньня **толькі зьдзекуецца над палітзьняволенымі.** Калі хвароба яшчэ не разьвілася, ён кажа: «трудна, усюды людзі хварэюць, нічога важнага». Калі-ж здароў'е зусім страчана, дык у яго адзін адказ: «Няма рады, і на свабодзе-б пан ня вылечыўся-б». Калі таварышы, зьнясіленыя голадам, звярачаліся, каб ім павялічылі норму турэмнай ежы — адказ доктара — «вага нармальная».

Палітзьняволеныя ў сувязі з наступленьнем фашызму пачалі зацятую барацьбу. У халодным, вільготным, цёмным карцэры ўсё больш часта прыходзіцца мёрзнуць таварышом. У знак пратэсту палітзьняволеныя 2—3 разы ў тыдзень ня прымаюць турэмных абедаў, вячэр, ня выходзяць на прагулку, наладжваюць дэманстрацыі, байкот загадаў адміністрацыі і г. д. Гэтыя пратэсты пераплятаюцца з дэманстрацыйнымі кароткімі галадоўкамі.

І гэтак тыдзень за тыднем, месяц за месяцам. Упартае наступленьне фашызму і ўпартая доўгатрываючая абарона, бо справа ідзе аб **умовах жыцьця дзесяткаў тысяч палітзьняволеных Польшчы.**

Галоўныя схваткі перад палітзьняволенымі яшчэ ўпераздзе.

Якія мэтады ўжывае фашызм, каб увесьці новы турэмны рэглямант, сьведчаць апошнія весткі **з Вільні, Горадні і інш. турмаў Заходняй Беларусі.** Новаарыштаваных палітзьняволеных трымаюць цэлымі месяцамі ізаляванымі ад рэшткі. **Упарта, плянава, на працягу гэтага часу б'юць іх, ня выпускаюць з карцэраў пакуль яны не падпішуць заявы, што згодны з рэглямантам.** Усё больш часта робіцца такі спосаб. **Палітзьняволенага вядуць нібы вешаць, накладваюць на шыю вяроўку, і ў апошні момант адчапляюць.** Гэта паўтараецца па некалькі раз.

Аднак, ня гледзячы на шалёны тэрор, палітзьняволеныя трымаюцца стойка. Змораныя фізычна, бледныя, з азызлымі тварамі, нібы палітымі вадою ад недаяданьня... з цьвёрдым бляскам у вачох, гатоўнасьць на ўсё, верай, што хутка канец праклятаму, наскрозь прагніламу капіталізму, што аб іх памятае «воля», а перш за ўсё працоўныя Савецкага саюзу.

Палітзьняволены турмы Вронкі
Ш.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Адкрылася ўсебеларуская мастацкая выстаўка

Гэтымі днямі ў галоўным корпусе Унівэрсытэцкага гарадка, у прысутнасьці прадстаўнікоў савецкай грамадзкасьці, пісьменьнікаў, мастакоў і студэнцтва адкрылася V усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва.

Выстаўку адкрыў прадстаўнік выстаўкому разьбяр **Грубэ.**

З прывітаньнем ад імя Народнага Камісарыяту Асьветы выступіў акадэмік **С. Я. Вальфсон.**

— Выяўленчае мастацтва, — зазначыў у сваёй прамове тав. Вальфсон,—зьяўляецца ў нас адным з магутных сродкаў выхаваньня працоўных мас, далучэньня гэтых мас да разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Вальфсон падкрэсьліў, што сам факт арганізацыі выстаўкі зьяўляецца вялікім сьвятам беларускай савецкай культуры. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка адкрыла шырокія творчыя магчымасьці перад савецкімі мастакамі і мы бачым на экспанатах выстаўкі, што апошнія месяцы далі новыя перамогі на фронце выяўленчага мастацтва БССР. Савецкія мастакі адказваюць на гістарычную пастанову ЦК палотнамі глыбейшага сацыялістычнага зьместу і значэньня.

— Вітаючы калектыў мастакоў Савецкай Беларусі ад імя НКА — гаворыць тав. Вальфсон, — мне хочацца зьвярнуць асаблівую ўвагу на праблему аўладаньня высокай тэхнікай, іменна майстэрствам, якога дагэтуль незаўсёды хапала нашым мастаком.

З прамовай ад імя менскіх мастакоў выступіў тав. **Кастэлянскі,** які адзначыў творчы рост беларускіх савецкіх мастакоў за перыяд ад мінулай IV выстаўкі па сёньняшні дзень.

— У той час, калі, напрыклад, на апошняй выстаўцы ў Парыжы дэманстраваліся гнілыя, упадніцкія настроі дэклясаваных мастакоў Францыі (самая «модная» тэма—«Сьмерць паяца!»),—мы маем паглыбленьне тэматыкі побач з фармальна-тэхнічным зрухам наперад у творчасьці нашых мастакоў перамогшага пралетарыяту.

Так, у творах лепшых мастакоў Беларусі, прадстаўленых на V выстаўцы, ёсьць больш-менш удалыя спробы адлюстраваньня жыцьця і быту Чырвонай арміі (Аксельрод, Бразэр, Кругер), калектывізацыі вёскі (Шаўчэнка, Бэмбель), новага быту (Забораў). Асабліва вызначаюцца палітычныя тэмы ў Ахрэмчыка—(«Другі зьезд партыі»), Грубэ («Ленін праваднір мас»), Семашкевіча (Заходняя Беларусь).

— Мы ня мысьлім сваю работу,—заканчвае тав. Кастэлянскі,— без шырокай крытыкі і дапамогі з боку працоўных мас. Толькі ў цеснай сувязі з масамі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы здолеем даць творы, вартыя нашай вялікай эпохі.

З прамовай ад імя «ІЗОРАМ'у» (мастацкага маладняка) выступіў на адкрыцьці выстаўкі тав. **Ідэльсон.**

Юр. Л.

Новы парадак продажу і браніяваньня чыгуначных білетаў

Для лепшага абслугоўваньня пасажыраў, з 20-га лістапада на станцыі Менск—пасажырская ўсталюўлен новы парадак продажу білетаў. Пасьля адпраўленьня таго ці іншага цягніка праз 20 хвілін адкрываецца каса для продажу білетаў на наступны чарговы цягнік. Продаж білетаў праводзіцца круглыя суткі.

Апрача таго, для больш правільнага і лепшага разьмеркаваньня месц на браніяваньні, з 20 лістапада заяўкі на броню будуць прымацца толькі ў ЦК КП(б)Б, ЦВК, СНК, НК-РСІ, ДПУ, упаўнаважанага НКШЗ і ў каменданта станцыі. У паказаных установах вылучаюцца спэцыяльныя работнікі, якія будуць выдаваць талёны на броні. Да выпуску стандартных талёнаў будуць выдавацца талёны, надрукаваныя на машынцы, з пячаткай установы.

Нявыкарыстаныя браніяваныя месцы на кур'ерскі цягнік за 15 хвілін да адыходу і на ўсе астатнія цягнікі за 30 хвілін перадаюцца для агульнага продажу пасажырам.

Мерапрыемствы па паляпшэньні матар'яльна-бытавога становішча журналістаў

Прэзыдыум ЦП саюзу друкароў Беларусі па апошнім пасяджэньні вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па паляпшэньні матар'яльна-бытавога становішча работнікаў друку.

Перад Наркамснабам узьнята пытаньне аб прыраўненьні работнікаў друку да рабочых у адносінах абслугоўваньня сталовымі, ЗРК, прыгараднымі гаспадаркамі і прымацаваньні кіруючых работнікаў да адпаведных разьмеркавальнікаў і сталовак партактыву, а ў раёнах да сталовак «дваццаткі».

Падтрымана ініцыятыва рэдакцыі і друкарні «Зьвязды» аб арганізацыі імі аб'яднанай сталоўкі. Адначасова з будучага году павінна быць арганізавана самастойная прыгарадная гаспадарка.

Прэзыдыум ЦП ухваліў ініцыятыву прафарганізацый і адміністрацыі газэт «Зьвязда», «Рабочий» і «Савецкая Беларусь» аб пабудове ў 1933 годзе 40-кватэрнага дому для работнікаў друку на ўмовах жыльлёвага каапэратыву.

Арганізуецца ўсебеларускі дом адпачынку работнікаў друку. Па прыкладу Масквы, Адэсы і г. Горкага праектуецца арганізацыя ў Менску дому работнікаў друку, дзе будзе сканцэнтравана масава-выхаваўчая работа сярод газэтных работнікаў і рабкораў, адкрыты пастаянныя курсы перападрыхтоўкі і агульна-гарадзкая сталоўка для работнікаў друку.

Рад мерапрыемстваў вызначаны па лініі ўзмацненьня прафработы і павышэньня кваліфікацыі работнікаў друку.

Хроніка

* **Племсаўгас па гадоўлі мясцовай беларускай сьвіньні** арганізуецца ў саўгасе Бранчыцы, Слуцкага раёну **(Белта).**

* **Загадчыкам катэдры** жывёлагадоўлі вышэйшай камуністычнай сельска-гаспадарчай школы Беларусі прызначан праф. **Журын С. І.;** катэдры мэханізацыі сельскай гаспадаркі—інжынэр-машынавед тав. **Захаранка;** катэдры эканомікі і арганізацыі с.-г.—спэцыяліст навукова-дасьледчага калгаснага інстытуту тав. **Клімко.**

* **Конкурс на лепшага фінударніка** праводзіць рэдакцыя дрысенскай газэты «Зьвязда на рубяжы» сумесна з райфа і раймясцкомам саюзу фінбанкаўскіх работнікаў.

* **Эшалён бульбы Ленінграду імя т. Гікало** арганізуюць калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі Гарбацэвіцкага сельсавету, Бабруйскага раёну.

* **Паравоз сэрыі Щ-324** выпусьціла звыш пляну камсамольская брыгада дэпо ст. Ворша ў падарунак 15-й гадавіне Кастрычніка. Грошы, атрыманыя за рамонт, пераданы МОПР'у.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр
СЁНЬНЯ
спэктакль дзярж. балету
Пачатак у 8 г. 30 м.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Савецкая, 28 тэл. 15-20
БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ.
Н. Федзін.
СЁНЬНЯ
ЧЫНГІЛЬБУД П'еса ў 3-х актах.
Пастаноўка В. Я. Галубчынера.
Музыка С. Палонскага. Танцы Е. І. Вульф
Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. Білеты ў касе тэатру з 12-2 і з 4-9 і ў рабочай касе з 12-2 і ад 4-6 гадз.
Па калектыўных заяўках—скідка.

Кіно „СПАРТАК“
З 20 лістапада мастацкі фільм
ВЕЛЬМІ ПРОСТА
Камэдыя ў 6 частках.
Штодзенна 5 сэансаў. Каса адкрыта з 4 г. 30 м.
Каса кіно з Камсамольскай вул.

Чырвон. Зорка
Каса—ад 1 г. дня
Гукавы мастацкі фільм
ІВАН

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
1) Дуглас Фэрбэнкс у фільме
СЫН ЗОРО
2) Кіно-хроніка САЮЗКІНО

Пралетары
Кацярына Ізмайлава
драма ў 7 частках
Дзённыя дзіцячыя сэансы мастацкі фільм у 7 част.
ЧОРНЫЯ ДНІ

10-ы перасоўачны
ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ
(Рог Рэспубліканскай і Інтэрнацыянальнай).
АДКРЫТ ШТОДЗЕННА
з 9 г. раніцы да 11 г. веч.
ПАКАЗАЛЬНАЕ КАРМЛЕНЬНЕ усіх экспанатаў у 8 г. веч.

Беларуская фабрыка мэханізаванага лічэньня
пры кіраўніцтве народна-гаспадарчага ўліку БССР
абвяшчае НАБОР
на фабзавуч-брыгаду пры фабрыцы ў колькасьці 30 асоб для падрыхтоўкі апэратараў на вылічальных і шчотна-аналітычных машынах і статыстычных работнікаў.
Тэрмін навучаньня 4 месяцы.
Прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодку і маюць падрыхтоўку ў аб'ёме 7 груп.
Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй ў памеры 60 руб. у месяц.
Жадаючыя паступіць падаюць заявы з дакумэнтамі аб сацыяльным паходжаньні, адукацыі, годзе нараджэньня,
не пазьней 25 лістапада.
Заняткі — з 1-га сьнежня.
Заявы падаваць асабіста ў дырэкцыю, рог Камуністычнай і Энгельса № 16.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Рэдакцыі газ. „Зьвязда“
ПАТРЭБЕН
ВОПЫТНЫ КАРЭКТАР
Звярачацца ў сакратарыят рэдакцыі— Савецкая, 63, 3-ці паверх.

ВЫШЛІ З ДРУКУ
і паступілі ў продаж
II і IV ТАМЫ
твораў Леніна
на белмове
Іншагароднім падпісчыкам, якія прайшлі перарэгістрацыю, паказаныя тамы высылаюцца накладной платай.
Падпісчыкі, якія пражываюць у г. Менску,
МОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ II, IV і V тамы
ў цэнтральнай кнігарні ДВБ (Ленінская, 15)
ЗА ПЛАТУ 1 руб. кожны том.
Менскі філіял ДВБ.

БЕЛВОДТРЭСТ
канчаткова складае вытворчы
ПЛЯН НА 1933 г.
па сьвідраваньні калодзежаў, абсталяваньні помпаў і пабудове водаправодаў.
Арганізацыі, якія не падалі заявак, павінны падаць іх
не пазьней 1 сьнежня 1932 г.
Тыя арганізацыі, якія да паказанага тэрміну не падалі заявак, НЯ БУДУЦЬ УКЛЮЧАНЫ Ў ПЛЯН 1933 г. і ў далейшым ніякія прэтэнзіі аб пабудовах прымацца не будуць.
БЕЛВОДТРЭСТ
г. Менск, Старажоўская, 11.

Сэктар кадраў Белкаапрамсавету
адкрывае
5-месячныя КУРСЫ
інструктараў-бухгальтараў.
На курсы прымаюцца рахунковыя работнікі, якія маюць практычны стаж ня ніжэй двух год, з адукацыяй ня ніжэй сямігодкі.
За курсантамі захоўваецца іх сярэдні месячны заработак на ўвесь час заняткаў на курсах.
Пасьля сканчэньня курсаў слухачы абавязаны працаваць у саюзах прамкаапэрацыі ў г. Менску ня менш двух год.
Заявы прымаюцца сэктарам кадраў Белкаапрамсавету (Інтэрнацыянальная, 9, 2-гі паверх пакой № 2) да 30 лістапада 1932 году.
СЭКТАР КАДРАЎ.

ДА ВЕДАМА
ЎСІХ УСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ
БЕЛАРУСКАЕ
аб'яднаньне культтавараў
„БАКТ“
перамясьцілася
з дому БКС (Савецкая, 43)
на РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ, 26.

МАШЫНІСТКА
шукае працу.
Савецкая 50, кв. 5.

СЁНЬНЯ, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу Мэдсанпрацы (Рэвалюцыйная вул.)
АДБУДЗЕЦЦА
ПЛЕНУМ ЦК ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ БССР.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Вынікі Усесаюзнага зьезду т-ва.
2) Аб працы ЦК з моманту 3-га ўсебеларускага зьезду.
3) Выкананьне бюджэту 1932 г., кантрольныя лічбы на 1933 г., і аб другой пяцігодцы.
4) Ваенна-санітарная праца.

УВАГА!
Для лепшага абслугоўваньня падпісчыкаў МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ даводзіць да ведама грамадзян, што
Ў КІЁСКАХ Саюздруку
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА
на мясцовыя і цэнтральныя газэты з правам атрыманьня ў кіёсках.
Менгарбюро Саюздруку.

МАШЫНІСТКА шукае працу на 3 гадз. Прапановы: Пошта, да запатрабаваньня Шумакевіч.

МЯНЯЮ пакой 18 кв. м. на меншы. Даведацца: Савецкая, 24, кв. 10-73, ад 6 да 9 г. веч.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.

Лінейная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2